**Сінчук І.І.** (Нацыянальны мастацкі музей, г. Мінск)

## УЗНАГАРОДНАЯ СІСТЭМА СССР – ВЕХІ РАЗВІЦЦЯ

Пасля Кастрычніцкага пераварота 1917 г. (уласна так яшчэ ў 1920-х гадах называлася Кастрычнічкая рэвалюцыя) была разбурана узнагародная сістэма Расійскай імперыі. Пасля Кастрычнікай рэвалюцыі ўсе узнагароды былі ліквідаваны дэкрэтам УЦВК і СНК ад 10(23).11.1917, але вельмі хутка ўзнікла неабходнасць ва ўвядзенні савецкіх ордэнаў. Вяртанне ідэі ганаровага знака ў выглядзе адзнакі, якая носіцца публічна на вопратцы, пачалося на рэспубліканскіх узроўнях – таму што толькі 30.12.1922 г. рэспублікі аб'ядналіся у саюз. Ордэны рэспублік актыўна ужываліся ў 1918–1933 гг., у тым ліку рэспубліканскі ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР, які афіцыйна уручаўся з 1924 г. да 1932 г.




***Мал.1. Ордэн Працоўнага Чырвонага сцяга БССР з надпісамі на яўрэйскай, польскай і беларускай мовах і ордэнская кніжка да яго магілеўчаніна Марэева М.П., 1940 г.***

Пасля стварэння СССР з'явіліся агульнасаюзныя ордэны (1924–1991), колькасць якіх з цягам часу павялічвалася: Чырвонага Сцяга (1924), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1928), Леніна (1930), Чырвонай Зоркі (1930), «Знак Пашаны» (1935), Айчыннай вайны (2 ступені, 1942), Суворава (3 ступені, 1942), Кутузава (2 ступені, 1942; 3 ступені, 1943), Аляксандра Неўскага (1942), Багдана Хмяльніцкага (3 ступені, 1943), Славы (3 ступені, 1943), «Перамога» (1943), Ушакова (2 ступені, 1944), Нахімава (2 ступені, 1944), «Мацігераіня» (1944), «Мацярынская слава» (3 ступені, 1944), Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1967), Дружбы народаў (1972), Працоўнай славы (3 ступені, 1974), За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР (3 ступені, 1974), За асабістую мужнасць (1988).



***Мал.2. Нагрудныя знакі 62-га Суздальскага палка (з выяваю знака ордэна Св. Георгія), Каўказскай Коннай брыгады, пач. 20 ст. (з дрэўкамі двух сцягоў) (злева); ордэн Чырвонага Сцяга ўзору 1924 г. з рысамі палкавых знакаў (справа)***



***Мал.3. «Жалаваны» партрэт Пятра I (злева); ордэн Леніна ўзору 1930 г. і ўзору 1936 г. з рысамі ордэна Чырвонага Сцяга ўзору 1924 г. (справа)***

Больш таго, аднавілась і ідэя залатой узнагароднай зброі: ганаровая рэвалюцыйная зброя ıатая зброя з ордэнам Чырвонага Сцяга) – узнагарода «вышэйшым начальніцкім асобам», ıглядзе: а) шашкі (корціка) (1919, 1920–1921, 1929), б) «рэвальвера» (1921); у 1968 г. была дзена Ганаровая зброя з залатою выяваю Дзяржаўнага герба СССР.



Мал.4. Зорка да першай ступені ордэна Св. Аляксандра Неўскага з брыльянтавымі ўпрыгажэннямі і імператарскай каронай, 19 ст. (злева); зоркападобны ордэн «Перамога», 1943 г. (справа)

З цягам часу вярнуліся да жыцця і медалі: першыя савецкія ўзнагародныя медалі ıіліся ў 1938 г. («За отвагу», «За боевые заслуги», «За трудовую доблесть», «За довое отличие») з аднолькавай лентай чырвонага колеру, на невялікай прамакутнай одцы баявыя, на трохкутнай – працоўныя. Узнагародныя медалі СССР налічваюць ,...го 55 медалеў і два асобных знакі ў выглядзе зорак – Медаль «Залатая Зорка» і Залаты медаль «Серп і Молат». Лес савецкіх медалеў быў такі ж , як медалёў Расійскай імперыі апошніх гадоў яе існавання – колькасць узнагагод павялічвалася, іх аўтарытэт падаў. Палова савецкіх узнагародных медалёў мела тыраж большы за 1 млн. экз. Усяго з 1938 па 1991 г. была выдадзена ўзнагароджаным звыш 197 млн. медалёў СССР.



Мал.5. Медалі СССР узору 1938 г. (зверху) і 1943 г. (знізу) «За адвагу» (дыяметр 37 мм) і «За працоўную адзнаку» (дыяметр 32 мм)

Сёння можна шчыра казаць пра спецыфіку ўзнагароднай сістэмы СССР. часам утвараліся парадаксальныя сітуацыя і пэўныя алюзіі пры рэалізацыі яе прынцыпаў, гэта:

– адказ ад прынцыпаў расійскіх ордэнаў і запазычванні ад іх,

– знішчэнне саслоўяў і класавасць,

– роўнасць і сацыяльная стратыфікацыя,

– «партрэтны» ордэн і колішнія «жалаваныя» імператарскія партрэты,

– адсутнасць знакаў адрознення ордэнаў і наяўнасць аднайменных ордэнам медалёў,

– адначасовае нашэнне знакаў усіх ступеняў,

– адсутнасць зорак як дадатковых адзнак вышэйшых ступеняў ордэнаў,

– зоркападобныя знакі як знакі ордэнаў,

– знакі для паўторных узнагароджванняў,

– адсутнасць фармалізаванай іерархіі ўзнагарод рэспублік і СССР,

– падвойныя ўзнагароджванні за адзін учынак,

– адсутнасць ордэнскай стужкі (1918–1938),

– «ордэнская» стужка аднаго колеру для розных узнагарод (1938–1943),

– асобнае існаванне пэўных ордэнаў і іх лент (1943–1991),

– з'яўленне ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга – фактычны падзел адзінага (вышэйшага да 1930 г.) ордэна на вайсковую і цывільную разнавіднасці,

– фактычны падзел вышэйшай ўзнагароды на ваенную і цывільную – залатая зорка Героя Савецкага Саюза (1939–1991) і залатая зорка (залаты медаль «Серп і Молат») Героя Сацыялістычнай Працы (1940–1991),

– юрыдычны статус медаля ў вышэйшай узнагароды краіны і фактычны статус зоркі вышэйшага ордэна з магчымасцю неаднаразовага ўручэння,

– выхад за традыцыйныя межы нагрудных знакаў – бронзавы бюст у два натуральныя памеры двойчы Героя (безадносна характару атрыманых зорак) на яго радзіме,

– юрыдычны статус асобнага ордэна ў знака да ганаровага звання «Маці-гераіня» і фактычны статус вышэйшай ступені ордэна «Мацярынская слава»,

– цэльнаметалічная эмалевая калодка-бант (без ордэнскай стужкі з мацерыі) ордэна «Маці-гераіня», ордэна «Мацярынская слава», медаля «Медаль мацярынства»,

– фактычнае змыканне ганаровых званняў і некаторых узнагарод (носьбіты званняў Герояў, Гарадоў-герояў, Крэпасці-героя, Герояў Сацыялістычнай Працы і «кавалераў» ордэна «Маці-гераіня»),

– нагрудныя знакі як калектыўныя ўзнагароды,

– аказіянальныя ордэны,

– нацыянальная мова ў легендзе саюзнага ордэна (ордэн Багдана Хмяльніцкага).

Як і ў імперскія часы ў СССР з'явіліся нагрудныя знакі лаўрэатаў прэмій, але ўжо іншых: Ленінскай (1926–1934, 1957–1991), Сталінскай (1940–1952), Дзяржаўнай (1967–1991), Міжнароднай Сталінскай прэміі «За ўмацаванне міру і дружбы паміж народамі» (1949–1956), Міжнароднай Ленінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі» (1957–1991), Савета Міністраў СССР (1981 –1991), галіновых савецкіх прафсаюзаў (1982–1991), Ленінскага камсамола (1966–1991), спецыяльных галіновых прэмій ў галіне навукі і вытворчасці. Была характэрна прымяркаванасць уручэння прэмій да штогадовага свята.

Даволі самастойнымі па паходжанню былі нагрудныя знакі да ганаровых званняў (19 званняў народных і заслужаных работнікаў) (1936–1991).

Адводзілася асобая роля ўзнагародам для моладзі: значкоў і знакаў Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі, значкоў і знакаў рэспубліканскіх камсамольскіх арганізацый, Усесаюзнай піянерскай арганізацыі імя У.І. Леніна.

Цэнтральны камітэт Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі меў наступныя знакі:

а) нагрудныя ўзнагародныя знакі (Ганаровы знак УЛКСМ, Працоўная доблесць, Малады гвардзеец пяцігодкі, Малады гвардзеец X пяцігодкі, Залаты колас, Маладому перадавіку жывёлагадоўлі, Лепшаму маладому хлапкаробу, Настаўнік моладзі, Майстар-залатыя рукі, Майстар-умелец, Ударнік 1973 года, рашаючага года пяцігодкі, Ударнік 1974 года, вызначаючага года пяцігодкі, Ударнік 1975 года, Ударнік 1976 года, Воінская доблесць, Спартыўная доблесць, Піянерскаму важатаму, Лепшаму настаўніку-камсамольцу, За актыўную працу ў камсамоле, 50 гадоў з іменем У.І. Леніна, За актыўную працу па ахове грамадскага парадку, Мая Радзіма – СССР, За актыўнае развіцце маладзежнага турызму, Ленінскі залік, За выдатную вучобу і інш.);

б) нагрудныя знакі-пасведчанні (Кніга Гонару ЦК УЛКСМ, настольны медаль Камсамольскаму прапагандысту, Ганаровая грамата ЦК УЛКСМ).

Цэнтральны савет Усесаюзнай піянерскай арганізацыі імя У.І.Леніна меў нагрудныя ўзнагародныя знакі «За актыўную працу з піянерамі», «За актыўную працу».

Асаблівасцямі гэтых знакаў грамадскіх арганізацій былі:

– форма безкалодкавых знакаў на падставе знака члена УЛКСМ з дадатковымі элементамі і спецыфічная форма знакаў з калодкаю (на падставе зорак герояў і знакаў да ганаровых званняў),

– абазначэнне паўторных узнагароджванняў «За выдатную вучобу" спецыяльнай калодкай з годам узнагароджвання,

– практыка сумесных узнагарод з іншымі арганізацыямі для некаторых знакаў,

– адсутнасць у большасці выпадкаў індывідуальных узнагародных пасведчанняў, але выдача нагрудных знакаў у некаторых выпадках для адзначаных занясеннем у кнігу гонару ці граматаю,

– адсутнасць нумароў на знаках,

– невызначанасць парадку нашэння пры наяўнасці некалькіх узнагародных знакаў ці знака члена УЛКСМ і ўзнагароднага знака,

– прымяркаванасць уручэння часткі ўзнагародных знакаў да каляндарных святочных дат.

Не абмінула хваля узнагароджванняў і царкву ў СССР – у др. пал. 20 ст. з'явіліся ўзнагароды аддзеленай ад дзяржавы Рускай Праваслаўнай Царквы, колькасць якіх расла з цягам часу: ордэн святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра – 3 ступені (1957), ордэн прападобнага Сергія Раданежскага – 3 ступені (1978), ордэн святога апостала Андрэя Першазванага – 1 ступень (зорка і знак) (1988), ордэн святой роўнаапостальнай княгіні Вольгі – 3 ступені (1988), ордэн святого благавернага князя Данііла Маскоўскага – 3 ступені (1988), ордэн святога пакутніка Трыфана – 3 ступені (1995), ордэн свяціцеля Інакенція – 3 ступені (1996), ордэн святога благавернага царэвіча Дзмітрыя – 3 ступені (1997). У пачатку 21 ст. колькасць узнагарод працягвала павялічвацца: з'явіліся ордэн свяціцеля Макарыя – 3 ступені (2001), ордэн прападобнага Андрэя Рублёва – 3 ступені (2001), ордэн «Славы і гонару»

(2004, 2009 – 3 ступені), ордэн свяціцеля Алексія – 3 ступені (2004), ордэн святога прападобнага Серафіма Сароўскага – 3 ступені (2004), ордэн святога благавернага вялікага князя Дзмітрыя Данскога– 3 ступені (2004), ордэн прападобнай Ефрасінні – 3 ступені (2007), ордэн святога роўнаапостальнага Мікалая – 3 ступені (2012).

Таксама былі зацвержаны медалі РПЦ: медаль Прападобнага Сергія Раданежскага – 2 ступені (1978), медаль святого благавернага князя Данііла Маскоўскага (1988), медаль святога пакутніка Трыфана (1995), медаль свяціцеля Інакенція (1996); потым – медаль свяціцеля Макарыя (2001), медаль прападобнага Андрэя Рублёва – 2 ступені (2001), медаль святога прападобнага Серафіма Сароўскага – 2 ступені (2004), медаль прападобнай Ефрасінні (2007), медаль «Славы і гонару» (2004, з 2009 – 2 ступені).

Пэўныя рысы ўзнагароднай сістэмы СССР запазычыла і маладая ўзнагародная сістэма Рэспублікі Беларусь.

Ордэны Рэспублікі Беларусь уведзены законамі ад 13.04.1995, 2.07.1997, 21.05.2002: ордэн Айчыны (3 ступені, 1995), ордэн Воінскай Славы (1995), ордэн «За службу Радзіме» (3 ступені, 1997), ордэн «За асабістую мужнасць» (1997) , ордэн Пашаны (1997), ордэн Францыска Скарыны (1995), ордэн Маці (1995), ордэн Дружбы народаў (2002). Ордэн Кастуся Каліноўскага (1995) – скасаваны.

Як знак асобай адзнакі зацверджаны медаль Героя Беларусі (1995). Адзін з Герояў Беларусі – мітрапаліт Філарэт.

Да дзяржаўных медалёў РБ адносяцца: медаль «За адвагу» (1995), медаль «За адзнаку ў воінскай службе» (1997), медаль «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку» (1997), медаль «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай граніцы» (1997), медаль «За працоўныя заслугі» (1995), медаль Францыска Скарыны (1989), медаль «За бездакорную службу» (3 ступені, 1995), медаль «За адзнаку ў папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый» (2009).

Медалі ў РБ прызнаны не толькі дзяржаўныя, але і ведамасныя. Медалі носяцца пасля ордэнаў РБ па старшынству, перад узнагародамі былога СССР, а часам і пасля медалёў СССР. У РБ маюцца таксама нагрудныя знакі: да ганаровых званняў заслужаных работнікаў, дзяржаўныя юбілейныя нагрудныя знакі, ведамасныя юбілейныя нагрудныя знакі, ведамасныя ўзнагародныя нагрудныя знакі.

Асаблівасцямі ўзнагароднай сістэмы РБ з'яўляюцца:

– адсутнасць паўторных узнагароджанняў,

– прынцып сацыяльнай роўнасці,

– наяўнасць аднайменных ордэна і медаля, якія не звязаныя статутам (Францыска Скарыны),

– фактычнае вывядзеннне за ордэнскую сістэму вышэйшай узнагароды (медаль Героя Беларусі – толькі знак асаблівай адзнакі, выдаецца асобна, без ордэна),

– права на льготы толькі для Герояў Беларусі, поўных кавалераў ордэна Айчыны і адсутнасць гэтых правоў у кавалераў іншых ордэнаў,

– захаванне льгот для Герояў Савецкага Саюза, Герояў Сацыялістычнай Працы, поўных кавалераў ордэнаў Славы і Працоўнай Славы,

– фактычны працяг пэўных узнагародных традыцый СССР (да ўзнагароджання ордэнам Айчыны прадстаўляюцца асобы, раней ўзнагароджаныя ордэнам ці медалём РБ ці ордэнам былога СССР; не прадстаўляюцца да ўзнагароджання ордэнам Маці мнагадзетныя маці, якім прысвоена раней званне «Маці-гераіня» або ўручаны ордэн «Мацярынская Слава» ці медаль «Медаль мацярынства»; ордэн «За службу Радзіме» II ступені можа атрымаць кавалер савецкага ордэна «За службу Радзіме» III ступені),

– адсутнасць забароны нашэння узнагарод СССР, дзяржаўныя ўзнагароды РБ па закону РБ ад 2.07.1997 размяшчаюцца перад узнагародамі СССР.

Кароткі агляд паказвае даволі стыхійны характар складання заблытанай і нелагічнай узнагароднай сістэмы СССР, якая яшчэ пэўны час будзе нашай сучаснасцю.


1. Ордена и медали СССР. – М., 1986.
2. Сборник законодательных актов о государственных наградах СССР. – М., 1987.
3. Деммени, М.Г. Сборник указов по монетному и медальному делу в России, помещенных в Полном собрании законов с 1649 по 1881 г. / М.Г. Деммени.– Спб., 1887 – Вып.1–3.
4. Дуров, В.А. Русское наградное оружие XVIII – начала XX вв. / В.А Дуров. – Москва–Смоленск, 1994.
5. Дуров, В.А. Ордена России/ В.А. Дуров. – М., 1993.
6. Ильинский, И.Н. Геральдика трудовой славы / И.Н. Ильинский. – М., 1987.
7. Колесников, Г.А. Ордена и медали СССР / Г.А. Колесников., А.М. Рожков. – М., 1974.
8. Кузнецов, А.А. Награды: Энциклопедический путеводитель по истории российских наград / А.А. Кузнецов. – М., 1999
9. Куценко, А. Ордена Советских республик / А. Куценко, Ю. Смирнов. – Донецк, 1996.
10. Лобусов, В. Награды ЦК ВЛКСМ /В. Лобусов, Ю. Лавриненко. – М., 1976.
11. Петерс, Д.И. Наградные медали России XIX – начала XX веков: Каталог. /Д.И., Петерс. – М., 1989.
12. Шевелева, Е. Каталог отечественных орденов, медалей и нагрудных знаков / Е. Шевелева. –Ленинград, 1962.


**Соботковская О.Н.** (Брестский государственный технический университет)

## СОВРЕМЕННОЕ ПРОЧТЕНИЕ СОВЕТСКОГО МЕНТАЛИТЕТА

В последние годы в связи с распадом СССР и снятием барьеров, препятствующих широким контактам жителей постсоветского пространства с гражданами других стран, стали отчетливо заметны многочисленные отличия советских людей от представителей иных культур. В этой связи в науку и публицистику вошло и прочно в ней закрепилось характеризующее психологический аспект этих отличий понятие «менталитет».

Категория «менталитет» стала активно употребляться в науке с конца 1980-х гг. XX века, однако до сих пор она является предметом споров и обсуждений ученых с точки зрения ее составляющих, а также схожих с понятием «менталитет» терминов. Что касается подходов к рассмотрению данного феномена, то и здесь не наблюдается единства мнений. В каждом подходе упор сделан на определенную сторону: историю (исторические процессы и менталитет), психологию (психический склад), философию (коллективное бессознательное, душа, дух народа) и т.д.

У истоков психологического подхода стоял К.Г. Юнг; его работу «Коллективное бессознательное», опубликованную в 1921 году, можно отнести как к философскому, так и к психологическому направлению исследования менталитета [2]. В наше время исследованиям менталитета посвящены работы Т.В. Ивановой (городская ментальность) [3], К.А. Абульхановой (менталитет как психосоциальная реальность) [1] и др. В учебнике В.Г. Крысько «Социальная психология» менталитет трактуется как «стиль жизни, культуры; система ценностей, взглядов, мировоззрения, черт характера и норм поведения» [4]. А в словаре «Социальная психология» под редакцией М.Ю. Кондратьева менталитет определяется как «специфика психической жизни людей, детерминированная... экономическими и политическими обстоятельствами и имеющая надсознательный характер» [5].